# ЧАЛАВЕК БЕЗ РАДЗІМЫ, ШТО САЛАВЕЙ БЕЗ ПЕСНІ



**Мы працягнем знаёмства** з творамі пра адносіны да роднай зямлі, Радзімы і хлеба; пра прыродныя сімвалы Беларусі і нацыянальную культуру нашага народа.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ вызначаць тэму і фармуляваць галоўную думку твораў;
- ✓ дзяліць апавяданні на сэнсавыя часткі і даваць ім загалоўкі;
- ✓ выказваць свае адносіны да персанажаў, іх учынкаў і зместу твора;
- ✓ выразна і правільна чытаць тэксты ўголас.

**Варта задумацца.** Навошта трэба ведаць прыродныя сімвалы сваёй Радзімы і цікавіцца нацыянальнай культурай свайго народа?



Правообладатель Национальный институт образования



## АДАМ РУСАК

# Мой край

Куды ні глянь — лясы шумяць,
цвіце за полем гай,
а поле — вокам не абняць.
І гэта ўсё — мой край.

Пшаніца, жыта на палях,
усюды ўраджай,
стагі, як горы, на лугах.
І гэта ўсё — мой край.

Жыве, працуе мой народ
ці ў снежань, ці ў май,
і харашэе з года ў год
мой родны, вольны край.

Куды ні глянь — лясы шумяць,
за полем — рэчка, гай.
І ў сэрцы песні не стрымаць
пра мой любімы край.





Правообладатель Национальный институт образования

1. Што падказвае чытачу, што ў вершы апісваецца беларускі край? Пацвердзіце адпаведнымі радкамі.
2. Якія малюнкі вы ўяўляеце ў час чытання твора? Вусна апішыце іх.
3. Патлумачце сэнс радкоў «І ў сэрцы песні не стрымаць...».
4. Што хацеў сказаць чытачам сваім творам Адам Русак?
5. Падумайце, якія пачуцці трэба перадаць пры чытанні гэтага твора.
6. Вывучыце верш на памяць.

## У свеце прыгожага

**Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Сяргея Кавальчука «Далячыні». Якія радкі з верша Адама Русака «Мой край» найбольш падыходзяць да твора жывапісу?**





Правообладатель Национальный институт образования

Пазнаёмцеся з прыказкамі пра Радзіму. Растлумачце іх сэнс.

## ПРЫКАЗКІ

- У сваім кра́і, як у ра́і.
- Кожная птушка сваё гняздо ведае.
- Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
- Радзіма — матка, чужы́на — мачыха.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш Раісы Раманчук. Правільна вымаўляйце гукі [ў], [дз’], [г], [ч], [ц’], спалучэнне гукаў [шч].

* * *

Крыні**ч**каю ла**г**однай
Няхай **цячэ г**амонка,
Няхай **шч**ыруе мова
Над любаю старонкай!
Няхай на роднай мове
Усе лю**дз**і разма**ў**ляю**ць**,
Ра**дз**іму, Мову, Ма**ц**і
Ніяк не раз**дз**яляю**ць**!

***Пяшчо́та*** — пачуццё ласкі, мяккасці ў адносінах да каго-небудзь.
***Вячо́ркі*** — зборы вясковай моладзі зімовымі або асеннімі вечарамі для сумеснай работы, забавы.



Правообладатель Национальный институт образования